ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
28
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 7 (1457)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

## ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА - СЁННЯ - ЗАЎТРА*

### Савет

універсітэта на чарговым пасяджэнні абмеркаваў вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі 1984—85 навучальнага года. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце дацэнт У. С. Багданаў.

Разгледжаны іншыя пытанні.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### Аб падрыхтоўцы

да агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці супрацоўнікаў ішла размова на пасяджэнні культурна-масавай камісіі прафсаюзнага камітэта. Было разгледжана таксама пытанне аб стане культмасавай работы на хімічным факультэце і ў НДІ ФХП.

А. ПАДАЛКА,
супрацоўніца аддзела навукова-тэхнічнай інфармацыі.

### У рабоце агітпоезда

«Ленінскі камсамол» у Тульскай і Арлоўскай абласцях у саставе мастацка-прапагандысцкай групы ЦК ЛКСМБ прымае ўдзел універсітэцкі фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш».

Э. АНІСЕНКА.
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

### Масавыя спаборніцтвы

ў праграме тыдня лыжнага спорту прайшлі ва універсітэце ў мінулую нядзелю. На старт выйшлі сотні студэнтаў, многія з якіх здалі нарматывы комплексу ГПА.

Л. КАПЫЛОВА,
старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

### Выдатна выступілі

на першынстве ВНУ рэспублікі па зімоваму спартыўнаму арыентаванню спартсмены універсітэта, якія занялі другое агульнакаманднае месца. На іх рахунку перамога ў самым складаным відзе спаборніцтваў — эстафеце.

А. БАЛДЗІН,
старшыня спартыўнага клуба.

НАСУСТРАЧ 40-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ

## ПОДЗВІГ БАЦЬКОЎ — У СПАДЧЫНУ МОЛАДЗІ



*ПЕРАМОГА ў Вялікай Айчыннай вайне была атрымана савецкім народам у імя міру і жыцця на зямлі. Сваім пазбаўленнем ад пагрозы фашысцкага рабства, сваёй свабодай чалавецтва ў рашаючай ступені абавязана першай у свеце сацыялістычнай дзяржаве, яе гістарычнай Перамозе над ворагам.*

*Сёння, напярэдадні 40-годдзя Вялікай Перамогі, мы ўсё часцей і часцей звяртаемся да гераічнага мінулага, да падзей Вялікай Айчыннай. Гэта яшчэ раз яскрава пацвердзіла навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Вялікая Перамога савецкага народа. 1941—1945», якая прайшла на днях у нашым універсітэце.*



*На ёй прысутнічалі загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ Ю. П. Смірноў, намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР С. А. Малевіч, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Маскоўскага райкома партыі У. Б. Лушчыцкі.*

*Адкрыў канферэнцыю сакратар парткома, доктар фізіка-матэматычных навук М. І. Дзямчук.*

*На пленарным пасяджэнні з дакладамі выступілі доктар гістарычных навук, прафесар В. К. Коршук «Камуністычная партыя — натхніцель і арганізатар Вялікай Перамогі»; удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны Герой Савецкага Саюза, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт М. Я. Зайцаў «Выдатны подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне»; доктар гістарычных навук, прафесар К. К. Герман «Усенародная барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Беларусі»; Герой Савецкага Саюза, доктар гістарычных навук, прафесар Д. П. Жмуроўскі «Сусветна-гістарычнае значэнне Перамогі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне».*

*У заключным слове намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце А. Г. Слука паведаміў, што на другі дзень работы канферэнцыі на ўсіх дванаццаці факультэтах пройдуць секцыйныя пасяджэнні, на якіх будзе прачытана каля 150 дакладаў. Ён адзначыў, што навукова-тэарэтычная канферэнцыя мае вялікае значэнне ў справе камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі на прыкладзе гераічнага подзвігу савецкага народа ў гады ваеннага ліхалецця.*

З. АЛЯШКЕВІЧ.

НА ЗДЫМКАХ: у час работы навукова-тэарэтычнай канферэнцыі.

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

## «ЦАНІЦЕ ЧАС»

УСЕ ЧАСЦЕЙ і часцей ад людзей розных заняткаў і прафесій можна пачуць выраз «час — золата». Пытанне правільнага размеркавання часу цікавіць кожнага чалавека, у тым ліку і студэнта.

Сапраўды, як размеркаваць свой рабочы дзень так, каб усё паспець? Скажам прама: зрабіць гэта цяжка. І ўсё ж ёсць людзі, якія спраўляюцца з данай праблемай выдатна. У чым жа справа?

— Я лічу, што для таго, каб правільна размеркаваць час, неабходна кожны свой рабочы дзень планаваць загадзя, — гаворыць студэнтка 4-га курса фізічнага факультэта Святлана Максіменка.— Вельмі важна навучыцца рабіць гэта іменна зараз, бо з пачаткам самастойнай працоўнай дзейнасці аб'ём работы павялічыцца і час неабходна будзе выкарыстоўваць яшчэ больш эканомна.

— Святлана, а як ты плануеш свой час?

— У першую чаргу кожны вечар я складаю кароткі план таго, што мне неабходна будзе зрабіць заўтра. Заўсёды імкнуся ўсё запланаванае выканаць.

З раніцы я звычайна працую ў Беларускім рэспубліканскім навукова-вытворчым аб'яднанні парашковай металургіі (у аддзеле фізіка-хімічнага аналізу), затым наведваю бібліятэку. Пасля заняткаў рыхтуюся да лекцый і лабараторных.

— Ты з'яўляешся намеснікам сакратара камітэта камсамола факультэта па арганізацыйнай рабоце. Клопатаў, зразумела, шмат. Ты з абавязкамі спраўляешся, да таго ж і вучышся выдатна...

— Грамадская работа сапраўды забірае шмат часу. Даводзіцца кожны дзень за гадзіну-паўтары да пачатку заняткаў быць у камітэце камсамола, вырашаць розныя пытанні. Але мне заўсёды дапамагаюць камсамольскія актывісты А. Пагірніцкая, Т. Дрылёнак, В. Кулікоў і іншыя. Яны з душой выконваюць свае грамадскія даручэнні. З імі працаваць лёгка і цікава.

— А чым ты займаешся ў вольны час? Ды і наогул: ці ёсць ён у цябе?

— Зразумела, ёсць. І калі зроблены ўсе справы, я вельмі люблю шыць, вязаць, слухаць музыку. Часта хаджу ў філармонію на канцэрты, у тэатры, кіно, езджу за горад. Я лічу, што акрамя вучобы проста неабходна нечым захапляцца, наведваць універсітэцкія вечары, прымаць удзел у розных мерапрыемствах. Без гэтага студэнцкае жыццё немагчыма ўявіць.

Інтэрв'ю правяла А. МАЙСЕЙЧЫК,
студэнтка факультэта журналістыкі.

## НАСУСТРАЧ 40-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ



*У АКТАВАЙ ЗАЛЕ галоўнага корпуса мнагалюдна. Тут пачынаецца мітынг-канцэрт. Госці студэнтаў — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта, тыя, хто пайшоў на фронт у сорак першым. Тыя, хто ўздымаў разбураныя сцены роднага універсітэта, тыя, хто будаваў, хто і сёння ў страі.*

*Год сорак першы... Дваццаць другое. Месяц — чэрвень. Замест лекцый — вайна. Замест сшыткаў — патроны. Вытрымаць. Выстаяць. Мэта адна.*

*У 1941-м універсітэт рыхтаваўся да свайго дваццацігоддзя. У першыя дні вайны больш чым 450 студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў сталі на абарону сваёй Радзімы.*

*Беларускі універсітэт не паспеў эвакуіравацца. Большасць яго выхаванцаў засталіся ў Мінску. Георгій Фалевіч, Ніна Ярмоленка, Дзмітрый Майсееў, Уладзімір Пархімовіч — вось імёны тых, хто набліжаў дзень Перамогі.*

*Метраном адлічвае секунды. Мінута маўчання. Студэнты выносяць кветкі, якія ўскладаюцца да помніка У. І. Леніну, да мемарыяльнага Знака ў гонар подзвігу загінуўшых.*

*Сёння ўся моладзь планеты гаворыць: «Не» — агрэсіі, «не» — ядзернай катастрофе, «не» — сусветнай вайне. Пасля заканчэння мітынгу ўся зала спявае песню «Хай заўжды будзе сонца».*

Фота А. ВАЛОШЫНА.

## КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР

# НА КАНТРОЛІ — НАСЦЕННЫ ДРУК

**ФАКУЛЬТЭЦКІ насценны друк з'яўляецца прадметам асаблівай увагі партыйнага і прафсаюзнага камітэтаў, камітэта камсамола універсітэта. Для паляпшэння якасці насценнага друку рабілася і робіцца многае. Не раз для рэдактараў газет праводзіліся семінары, арганізаваныя рэдакцыяй газеты «Беларускі універсітэт», заняткі з кіраўнікамі сектараў друку прэс-цэнтра камітэта камсамола.**

**У час чарговай праверкі аказалася, што паверх гістфака замест газеты ўпрыгожвае яркасіні стэнд...**

**Не звяртаюць увагі на пастаянны напамінак аб адсутнасці стэнда для газеты на механіка-матэматычным факультэце. А падышоўшы да месца (далёка не самага ўдалага), дзе звычайна вывешваецца насценка, мы не ўбачылі не толькі газеты, але і стэнда.**

**Думаецца, кіраўніцтву названых факультэтаў час сур'ёзна звярнуць увагу на работу рэдкалегій, а мы чакаем ад іх паведамленняў аб рэалізацыі выказаных заўваг.**

**Ю. ВАРАТНІЦКІ.**

## ДА ВЫНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

# КАМУ ПРАЦАВАЦЬ У ІНТЭРНАТАХ?

ПАДВЕДЗЕНЫ вынікі сацыялістычнага спаборніцтва «За культурны быт» паміж калектывамі інтэрнатаў і факультэтаў за мінулы год. Сярод інтэрнатаў месцы размеркаваліся наступным чынам: I — інтэрнат № 7, II — № 6, III — № 1, IV — № 4, V — № 2, VI — № 3, VII — № 5. Лепшымі факультэтамі па рабоце ў інтэрнатах прызнаны мехмат, ФПМ, юрфак. Далей ідуць біяфак, хімфак, гістфак, журфак, філфак, геафак, факультэт радыёфізікі і электронікі, фізфак.

Справаздачы інтэрнатаў спісаны лічбамі, якія паказваюць колькасць праведзеных мерапрыемстваў, працэнт удзелу ў іх жыхароў. Якімі б ні былі лічбы сухімі, але яны красамоўна сведчаць аб праведзенай рабоце.

Работа ў інтэрнаце пачынаецца з засялення студэнтаў. Гэты абавязак ускладзены на прафсаюзныя бюро факультэтаў. Штогод складаюцца спісы. Здаюцца ў студгарадок, выпісваюцца ордэры, а потым... аказваецца, што патрэбны перасяленні. І перакрэсліваюцца зацверджаныя спісы, перапісваюцца ордэры. Асабліва многа такіх штогодніх перасяленняў у філфака, юрфака, гістфака, факультэта радыёфізікі і электронікі, біяфака. Прычыны перамены месц пражывання студэнтаў выказваюцца розныя, студгарадку даказваюць правільнасць перамен. Але ўзнікае пытанне: чаму жыллёва-бытавыя камісіі прафбюро факультэтаў не думалі аб гэтым вясной, калі складаліся спісы пражывання студэнтаў. Аднесліся да гэтага несур'ёзна — узнікла неразбярыха ў жніўні і верасні.

У інтэрнаце павінна адчувацца ўтульнасць, павінны быць створаны ўмовы для вучобы і адпачынку. Не заўсёды такое бывае. Часта калідоры, кухні інтэрнатаў забруджаны. Студэнты вінавацяць прыбіральшчыц, а камендант — дзяжурных па паверхах. Не заўсёды займаюцца гэтай справай і студсаветы, абмяжоўваючы сябе толькі рэйдавымі праверкамі санітарнага стану пакояў. У абавязкі дзяжурнага па паверху ўваходзіць пункт, дзе сказана, што дзяжурны павінен пастаянна падтрымліваць чысціню, але такое ўбачыш рэдка. Студсаветы не кантралююць дзейнасць дзяжурных.

Пытанне аб дзяжурстве з'яўляецца адным з самых балючых. У інтэрнаце № 6, відаць, вырашылі зусім «адмовіцца» ад яго, падумваюць аб гэтым і ў інтэрнаце № 2, бо зрывы дзяжурстваў тут сталі звычайнай з'явай.

Трэба звярнуць увагу і на афармленне чытальных залаў, ленінскіх пакояў. Іменна тут праводзяцца ўсе палітыка-выхаваўчыя мерапрыемствы. Чаму б, напрыклад, ФПМ не аформіць чытальную залу з выкарыстаннем матэматычных табліц, плакатаў, а філолагам не ўзяць за аснову тэмы нашай роднай літаратуры? Цікава аформілі чытальную залу на шостым паверсе інтэрната № 2 журналісты.

Работа ленінскіх пакояў яшчэ не нармалізавалася. Пры праверках прафкома пастаянна адсутнічаюць планы работы, няма дзяжурных па пакоях. Да нас паступаюць скаргі, што немагчыма паглядзець тэлеперадачы «Час», «Сёння ў свеце», «Здароўе» і іншыя па той прычыне, што дзверы зачынены.

Асноўныя формы правядзення палітыка-выхаваўчай работы ў інтэрнаце застаюцца традыцыйнымі — лекцыі, гутаркі, вечары пытанняў і адказаў, вечары адпачынку, якія затым ператвараюцца ў дыскатэкі. На жаль, мала ўвагі звяртаецца клубам па інтарэсах, розным конкурсам. Надышоў час мяняць стыль работы, рабіць мерапрыемствы больш цікавымі, змястоўнымі, тады не будзе нізкага працэнта ўдзелу студэнтаў у іх.

У інтэрнатах дрэнна наладжана радыёсувязь, бо не хапае тэхнічных сродкаў. Але і там, дзе яны ёсць — у інтэрнатах №№ 6 і 2,— выкарыстоўваюцца не лепшым чынам.

Патрэбна спыніцца і на насценным друку. Насценныя газеты выпускаюцца, як правіла, да свят. Якасць іх невысокая: перапісаныя артыкулы з газет, часопісаў, намаляваныя плакаты, вершы вядомых паэтаў — вось іх змест. А інфармацыя аб справах інтэрната адсутнічае. Прэс-цэнтр прафкома ўхіліўся ад кантролю за станам насценнага друку, яго старшыня І. Нярошчына не лічыць гэта сваім абавязкам. Марудна абнаўляецца наглядная агітацыя, асабліва ў інтэрнатах №№ 6, 1, 3.

У інтэрнатах сёлета праводзяцца мерапрыемствы, якія прысвечаны 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Студэнты аформілі стэнды, прысвечаныя падзеям ваенных часоў. але гэта не датычыцца інтэрната № 5. Дэканат падрыхтоўчага факультэта ўзяў работу на сябе. Але вынікаў яе пакуль не бачна. Не зроблены стэнды, мала праводзіцца ў інтэрнаце мерапрыемстваў.

Стымулам паляпшэння работы служыць сацыялістычнае спаборніцтва на лепшы інтэрнат, лепшы паверх і пакой. Рэктарат зацвердзіў палажэнне аб спаборніцтве. Жыллёва-бытавой камісіяй прафкома студэнтаў кожны месяц падводзяцца вынікі спаборніцтва на лепшы інтэрнат. А спаборніцтва на лепшы паверх і пакой інтэрната праводзіцца не ўсюды. Студсавет інтэрната № 1 зусім не падводзіць вынікаў, а ў інтэрнатах №№ 2 і 3 студэнты даведваюцца аб іх праз месяц і больш. ЖБК прафкома патрэбна ўзмацніць кантроль за ходам сацыялістычнага спаборніцтва ў інтэрнатах.

Мы не выпадкова звярнулі ўвагу на негатыўныя факты. Задача ўсіх адказных за работу ў інтэрнатах — ліквідаваць недахопы. І галоўны напрамак яе рашэння — каардынацыя дзейнасці ўсіх адказных. На жаль, не заўсёды яна наладжана. Так, за культурна-масавую работу ў інтэрнатах адказваюць камітэт камсамола, культурна-выхаваўчая камісія прафкома, факультэцкія арганізацыі, студсаветы. Агульнай мовы яны пакуль не знайшлі. І тут каардынатарам павінен быў выступіць намеснік дырэктара студгарадка па культурна-масавай рабоце А. М. Радзько. Але ён, скажам шчыра, не зусім адказна аднёсся да сваіх абавязкаў.

На некаторых факультэтах лічаць работу ў студсавеце другараднай. І выбіраюць студэнтаў малаініцыятыўных, якія не могуць па-дзелавому падысці да справы. Ці не гэтым тлумачыцца нізкая эфектыўнасць работы студсаветаў інтэрнатаў №№ 6, 2, 5? Студсавет інтэрната № 7 заняў першае месца, але галоўная заслуга ў гэтым студэнтаў мехмата, бо філолагі і географы мала ўдзельнічалі ў агульнай рабоце.

Як бачыце, праблем многа. Хочацца спадзявацца, што ў гэтым годзе ўсе арганізацыі, адказныя за работу ў інтэрнатах, сур'ёзна аднясуцца да справы, і пытанні будуць вырашаны.

**П. ЛАШЦЕНАК,**
намеснік старшыні прафкома студэнтаў.
**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**
наш кар.

## ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

# «Томік Шэкспіра і... пачак цыгарэт»

**ПАД ТАКІМ загалоўкам у нумары газеты за 1 лістапада мінулага года быў змешчаны артыкул нашага карэспандэнта. Напомнім, што аўтар, закрануўшы праблему курэння, выказаў нараканні на работу ў гэтым напрамку універсітэцкай паліклінікі.**

**Матэрыял быў дасланы на рэагаванне загадчыцы паліклінікі М. І. Цырульнікавай. Але дарэмна чакалі адказ у рэдакцыі на працягу трох месяцаў. Адказныя кіраўнікі лячэбнай установы захоўвалі непарушнае, а таму падазронае, маўчанне. З гэтай нагоды карэспандэнт газеты быў вымушаны асабіста наведаць кабінет М. І. Цырульнікавай. І як толькі ён выказаў жаданне пачуць адказ на пытанне: што робіцца супрацоўнікамі паліклінікі, каб выправіць існуючае становішча,— пачуў у адказ прыкладна тое ж самае, што і ў першы раз. У кароткай размове апошняе слова за сабой пакінула М. І. Цырульнікава:**

**— Не, пытанні прафілактыкі, барацьбы з курэннем у планы работы паліклінікі на бягучы год не ўносіліся.**

**Думаецца (тут мы звяртаемся да арганізацый, якія курыруюць работу студэнцкай паліклінікі), кропку над «і» у гэтай праблеме ставіць пакуль што рана.**

# БЫЦЬ

**У даным артыкуле хочацца спыніцца на тым, якім (у ідэале) павінен быць выкладчык ВНУ, у прыватнасці выкладчык грамадскіх дысцыплін, а таксама на тым, з якімі цяжкасцямі і праблемамі сутыкаецца выкладчык-грамадазнавец у сваёй рабоце.**

ВЫКЛАДЧЫК-ГРАМАДАЗНАВЕЦ — асобая фігура ў сістэме вышэйшай адукацыі. Гэта асаблівасць абумоўліваецца тым, што ён не проста перадае веды студэнцкай моладзі, але і непасрэдна ў працэсе заняткаў фарміруе асобу студэнта, дапамагае будучаму спецыялісту выпрацаваць марксісцка-ленінскі светапогляд, партыйны падыход да вырашэння актуальных праблем грамадскага развіцця, непрымірымасць да буржуазнай ідэалогіі. На вучэбных занятках па грамадскіх навуках пазнавальны і выхаваўчы аспекты выкладання знаходзяцца ў арганічным адзінстве. Для вузаўскага грамадзнаўца камуністычнае выхаванне студэнцтва — грамадзянскі доўг, прамы прафесійны абавязак.

Якімі якасцямі павінен валодаць грамадазнавец, як патрэбна арганізаваць яго дзейнасць, каб паспяхова вырашаць асноўную задачу выкладання грамадскіх навук у вышэйшай школе — задачу камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі?

Па роду сваёй дзейнасці выкладчык грамадскіх навук знаходзіцца амаль у беспярапынным кантакце са студэнтамі. Яго зносіны з імі не абмяжоўваюцца аўдыторнымі заняткамі. Прымаючы ўдзел у грамадска-палітычнай атэстацыі студэнтаў, наведваючы інтэрнаты, праводзячы вечары пытанняў і адказаў, кіруючы работай навуковага студэнцкага гуртка, выконваючы іншыя віды пазааўдыторнай ідэйна-выхаваўчай работы, выкладчык працягвае аказваць уздзеянне на фарміраванне асобы студэнта. Пры гэтым на студэнта ўплывае літаральна ўсё: ідэйная перакананасць выкладчыка, яго партыйныя прынцыповасць і мэтанакіраванасць, сацыяльная актыўнасць, культура мышлення і мовы, веданне прадмета і эрудыцыя, адносіны да дыскусійных і «вострых» пытанняў, маральнае аблічча і г. д.

Педагагічная практыка паказвае, што найбольшага поспеху ў камуністычным выхаванні студэнтаў дасягаюць тыя выкладчыкі, якія валодаюць глыбокімі ведамі і актыўна імкнуцца перадаць іх. Разам з тым, бясстраснае чытанне лекцый, абыякавыя адносіны выкладчыка да аўдыторыі ствараюць перадумовы для негатыўных адносін студэнтаў да выкладчыка. Усё гэта накладвае павышаную патрабавальнасць да вучэбна-метадычнай дзейнасці выкладчыкаў грамадскіх навук. У іх студэнты бачаць прадстаўнікоў партыі, заклікаsuccessful тлумачыць ім яе тэарэтычныя ўстаноўкі і практычныя дзеянні. Тут асабліва шкодныя негатыўныя адносіны да выкладчыка, бо яны часта пераносяцца на прадмет, які ён вядзе.

Эфектыўнасць камуністычнага выхавання залежыць таксама ад здольнасці выкладчыка заваяваць давер студэнтаў, выклікаць іх прыхільнасць да сябе. Нейкіх пэўных метадаў для дасягнення гэтага не існуе, усё вызначаецца асабістымі якасцямі самога выкладчыка, важнейшымі з якіх у даным вы-

ПАТРАБУЕ ВЫРАШЭННЯ

# У АДСУТНАСЦЬ СІСТЭМЫ...

**Камісіяй парткома і рэдакцыяй газеты «Беларускі універсітэт» праведзены рэйд па праверцы нагляднай агітацыі.**

КАЛІ РАЗГЛЯДАЦЬ кожны з факультэтаў паасобку, шмат у чым можна паўтарыцца, адзначаючы хутчэй не вартасці, а недахопы сродкаў нагляднай агітацыі. Таму хочацца адразу выказаць заўвагі, уласцівыя ўсім факультэтам. І найперш трэба адзначыць, што шматлікія ўбачаныя стэнды, лозунгі, газеты ствараюць уражанне, далёкае ад іх прамога прызначэння. Многае, што завецца нагляднай агітацыяй,— хутчэй упрыгожанне інтэр'ера холаў і калідораў розных вучэбных карпусоў. На жаль, не зусім удалае.

У сваім доме кожны імкнецца з густам расставіць мэблю, стварыць утульнасць і прыгажосць. Нікому і ў галаву б не прыйшло ставіць у адным пакоі канапы, секцыі і крэслы розных несумяшчальных гарнітураў, афарбовак і форм. Чамусьці праз гэтыя правілы лёгка пераступаюць на працы. Пацвярджэнне таму — рознафарматныя, несумяшчальныя ў колеры і аб'ёме ўсемагчымыя «Экраны», «Дошкі аб'яў» і інш. Такая несумяшчальнасць уласціва ўсім факультэтам, акрамя хіба факультэта радыёфізікі і электронікі і геаграфічнага. За апошні год яны набылі свой твар. Пажадана, каб гэтая сістэма вытрымлівалася і надалей.

Вынікі рэйду пакінулі ўражанне, нібы ў сродкаў нагляднай агітацыі няма гаспадара. І стэнды, афармленыя дзякуючы нечай «мінутнай» ініцыятыве, заваёўваюць права на бессмяротнасць. Ды ці толькі гэта? На біяфаку змешчаная інфармацыя групы народнага кантролю датавалася сакавіком 1984 года. Пустуюць не абноўленыя ўмовы сацыялістычнага спаборніцтва, не называюцца імёны пераможцаў. На фізічным факультэце размясціліся на розных паверхах дзве галерэі фотаздымкаў. Подпісы, якія б тлумачылі іх, адсутнічаюць. Інтуітыўна можна здагадацца, што гэта пераможцы. Але чаго? За які перыяд? Тут нават шляхам дэдукцыі не ўстанавіць ісціны.

Тое ж пачуццё адсутнасці сістэмы неадступна суправаджала камісію ў час наведвання мехмата. І выклікана гэта было не толькі стэндамі, для матэрыялаў якіх даўно мінулі ўсе тэрміны даўнасці. Тут даўно б час звярнуць увагу на змест і месца інфармацыі, якая вывешваецца на факультэце. Так, у выніку нечай неразборлівасці пад словамі «Все дела от мала до велика прекрасны, коль для Родины они...» вісіць аб'ява літаральна наступнага зместу: «Студэнты, што атрымалі ў сесію «нездавальняюча» не больш чым па дзвюх дысцыплінах, будуць пераздаваць экзамены з 14 сакавіка па раскладу».

Нехта можа запярэчыць, маўляў, гэта дробязі. Аднак ці не з іх складваецца агульнае ўражанне аб факультэце, вымалёўваецца агульны твар нагляднай агітацыі?

Сродкі нагляднай агітацыі павінны быць тварам кожнага факультэта. Гэта патрабаванне распаўсюджваецца і на змест, і на форму. Таму ў мастацкім афармленні холаў і калідораў патрэбна кіравацца пэўнай сістэмай. Удыхнуць жыццё ў яе павінны не толькі людзі, для каго гэта грамадскае даручэнне. Перш за ўсё неабходна заахвочваць і далучаць да справы асоб творчых і зацікаўленых. Тое, што яны ёсць на кожным факультэце,— сумненню не падлягае.

А каб афарміцельская работа не насіла стыхійны характар і была пазбаўлена аўральнасці, што яшчэ бытуе вельмі часта, мэтазгодна складаць перспектыўны план, скажам, на навучальны год, дзе б занатоўвалася, што патрэбна абнавіць, што замяніць наогул.

Усе гэтыя меры прывядуць да пэўнай сістэмы і парадку ў афармленні нагляднай агітацыі. Доказам можа служыць біяфакаўская «Vita», якая не адзін год з'яўляецца сінонімам выразу «лепшая насценгазета». Колькі чалавек змянілася ў рэдкалегіі, а газета застаецца ў сваім стылі, займае прызавыя месцы ва універсітэцкіх аглядах. А ўсё таму, што новыя члены рэдкалегіі працуюць па пэўнай, праверанай часам сістэме.

Вельмі адчувальна гэтага не хапае сродкам нагляднай агітацыі на многіх факультэтах.

Аднадушныя меркаванні рэйдавай камісіі запісаў
**В. ГРАМОВІЧ,**
наш кар.

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!



*ЁСЦЬ У ЗОІ КАЛТУНЧЫК, студэнткі факультэта прыкладной матэматыкі, асаблівая арганізатарская здольнасць. Да кожнага знойдзе яна падыход, здолее пераканаць. Не першы год займаецца Зоя прафсаюзнай работай. У мінулым навучальным годзе яна была старшынёй арганізацыйна-масавай камісіі прафкома. Сёлета студэнты ФПМ выбралі яе старшынёй прафсаюзнага бюро факультэта.*

*Навучальны год набліжаецца да завяршэння. І ўжо з упэўненасцю можна сказаць, што Зоя справілася са сваімі абавязкамі. Яе паважаюць аднакурснікі, цэняць выкладчыкі. «Дзяўчына добрасумленная, працалюбівая»,— гавораць пра яе ў прафкоме універсітэта. А нядаўна Зою Калтунчык прынялі кандыдатам у члены КПСС.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

АСОБА ВЫКЛАДЧЫКА — ГРАМАДАЗНАЎЦЫ

# НА ЎЗРОЎНІ ЧАСУ

падку з'яўляюцца павага да студэнтаў і давер да іх. Практыка паказвае, што імкненне заваяваць аўтарытэт студэнтаў шляхам зніжэння патрабавальнасці асуджаецца большасцю з іх. Найбольшым аўтарытэтам у студэнтаў карыстаюцца выкладчыкі патрабавальныя, калі, безумоўна, патрабавальнасць спалучаецца з даверам, павагай, справядлівасцю ў адносінах да іх.

Педагагічная практыка паказвае таксама, што грамадазнавец павінен звяртацца не толькі да розуму студэнтаў, але і да іх эмоцый і пачуццяў. Шлях да камуністычнай перакананасці студэнта ляжыць і праз яго эмацыянальнасць. Веды ператвараюцца ў перакананні, калі яны не толькі «прадуманы», але і «пражыты», сталі неад'емнай рысай духоўнага свету чалавека. Пэўнае значэнне ў выкладанні грамадскіх навук мае эмацыянальнасць выкладчыка, яго ідэйная перакананасць, якія перадаюцца і студэнтам.

Выкладчык у адносінах са студэнтамі не павінен прыстасоўвацца да светапогляднага і ацэначнага ўзроўню апошніх, а падымаць яго да свайго ўзроўню светаразумення і ацэнак. У даным выпадку патрэбна не павучанне. Захапленне апошнім прыводзіць да ўзнікнення пэўнага духоўнага бар'ера паміж выкладчыкам і студэнтам. Калі ж студэнт адчувае сяброўскія адносіны выкладчыка да сябе, то пранікаецца павагай і даверам да яго. Зразумела, што панібрацтва паміж выкладчыкам і студэнтам недапушчальна, але таварыскія адносіны, заснаваныя на ўзаемнай павазе, неабходныя. Гэта стварае спрыяльныя магчымасці для фарміравання важных рыс асобы будучага спецыяліста: сацыяльнай сталасці і інтэлектуальнай самастойнасці.

Асоба выкладчыка, яго веды і метадычнае майстэрства аказваюць уздзеянне на фарміраванне ў студэнтаў самастойнасці мышлення. Гэта — абавязковая ўмова для ператварэння ведаў у глыбокія перакананні.

На фарміраванне самастойнасці мышлення ў будучых спецыялістаў аказвае ўздзеянне змест лекцый (у прыватнасці, у якой ступені ўзнімаюцца на іх дыскусійныя пытанні) і форма іх правядзення (арыентуе яна студэнтаў на простае запамінанне, пасіўнае ўспрыняцце матэрыялу ці стымулюе творчую актыўнасць іх свядомасці).

Вялікія магчымасці ў справе камуністычнага выхавання выкладчык мае на семінарскіх занятках. Яны дапамагаюць яму ўстанавіць са студэнтамі цесны кантакт, атрымаць уяўленне аб іх жыццёвых прынцыпах, надзённых пытаннях. Дасягненне гэтага ў многім вызначаецца асаблівасцямі асобы выкладчыка, яго педагагічным майстэрствам. Ад выкладчыка, напрыклад, у рашаючай ступені залежыць стварэнне на занятках атмасферы здаровага спаборніцтва. Яно з'яўляецца магутным сродкам павышэння эфектыўнасці любой працы. Імкненне пераўзысці таварыша па аб'ёму і глыбіні ведаў становіча адбіваецца на пасняховасці, садзейнічае росту сацыяльнай актыўнасці і інтэлектуальнай самастойнасці студэнцкай моладзі.

Эфектыўнай формай правядзення індывідуальнай выхаваўчай работы са студэнтамі з'яўляюцца залікі і экзамены. Думаецца, што правільна робяць тыя выкладчыкі, якія ўзгадняюць са студэнтамі выстаўляемыя імі адзнакі. У гэтым праяўляецца павага да асобы экзаменуемага. Вельмі неабходны на заліках і экзаменах добразычлівасць выкладчыка, яго добры настрой, уменне валодаць сабой. Зразумела, што станоўчыя адносіны да студэнтаў на заліках і экзаменах павінны спалучацца з патрабавальнасцю, прынцыповасцю.

Педагагічная дзейнасць выкладчыка павінна быць арганізавана такім чынам, каб у студэнта ўзнікала жаданне выйсці за межы праграмных пытанняў: у гэтым ужо праяўляецца яго імкненне да самастойнай інтэлектуальнай творчасці, да навукова-даследчай работы.

Гады вучобы ў вышэйшай навучальнай установе — гэта гады інтэнсіўнага інтэлектуальнага развіцця маладых людзей. У гэты час працягвае фарміравацца іх здольнасць думаць самастойна і творча. Лепшы метад фарміравання творчай актыўнасці мышлення студэнтаў — праблемнае выкладанне. Такое выкладанне патрабуе, па-першае, сістэматычнай работы над новай навуковай літаратурай, партыйнымі дакументамі, творамі класікаў марксізму-ленінізму і кіраўнікоў партыі і ўрада. Па-другое, пастаяннага ўдасканалення методыкі правядзення заняткаў. А гэта даволі складаная задача. Дастаткова сказаць, што, напрыклад, па філасофскай праблематыцы толькі ў нас у краіне выдаецца звыш 600 кніг і перыядычных выданняў. Калі нават 10 працэнтаў гэтай літаратуры мае адносіны да прадмета выкладання, напрыклад, дыялектычнага матэрыялізму, не цяжка ўявіць, колькі часу неабходна выкладчыку для хаця б беглага прагляду яе. Нямала часу забірае і работа над методыкай выкладання, якая патрабуе вывучэння метадычнай, педагагічнай і псіхалагічнай літаратуры.

Дзейнасць вузаўскага грамадазнаўца шматпланавая. Яна не абмяжоўваецца аўдыторнай і пазааўдыторнай работай са студэнтамі. Важнае месца ў агульнай структуры дзейнасці выкладчыка займае грамадская і навукова-даследчая работа. Грамадазнаўцы — адны з самых кваліфікаваных прапагандыстаў марксізму-ленінізму. Іх веды і вопыт, якія назапашваюцца на працягу многіх гадоў выкладання ў ВНУ, не могуць не выкарыстоўвацца ў лекцыйнай прапагандзе. Удасканаленне развітога сацыялізму, якое праходзіць ва ўмовах вострай ідэалагічнай барацьбы, абумоўлівае неабходнасць усё больш шырокага ўдзелу выкладчыкаў грамадскіх навук у ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай рабоце партыі.

Важнае месца ў структуры дзейнасці выкладчыка займае навукова-даследчая работа, аб эфектыўнасці якой можна меркаваць па аб'ёму публікацый. Лічыцца, што прафесійнае майстэрства грамадазнаўца знаходзіцца ў прамой залежнасці ад гэтага паказчыка. Аднак не ва ўсіх выпадках гэта адпавядае рэчаіснасці. І вось чаму.

Для некаторых выкладчыкаў галоўнай задачай становіцца не выкладанне, а напісанне артыкулаў і манаграфій. У пагоні за колькасцю публікацый і іх аб'ёмам такія выкладчыкі нярэдка запускаюць вучэбна-метадычную і ідэйна-выхаваўчую работу, што адмоўна адбіваецца на якасці выкладання і, як вынік, на эфектыўнасці камуністычнага выхавання. Разам з тым, нельга вельмі строга асуджаць гэтых выкладчыкаў, таму што сумясціць вучэбную, вучэбна-метадычную, навукова-даследчую, пазааўдыторную і грамадскую работу вузаўскага грамадазнаўцы, не наносячы ўбытку ні аднаму з гэтых відаў работ, практычна немагчыма.

Існуючая практыка атэстацыі грамадазнаўцаў разам са станоўчымі мае і адмоўныя аспекты. Да апошніх можна аднесці работу выкладчыка, як кажуць, на «мяжы магчымага», калі пры добрасумленных адносінах да сваіх педагагічных абавязкаў навукова-даследчая работа адкладваецца выкладчыкам на водпуск, выхадныя і святочныя дні. Гэта і немалы працэнт недапрацаваных, нікому не патрэбных манаграфій, якія гадамі стаяць на паліцах кніжных магазінаў, а затым спісваюцца. І тое, што нярэдка ў маральным і матэрыяльным пройгрышы аказваюцца тыя выкладчыкі, якія галоўную сваю задачу бачаць у жывых гутарках са студэнтамі, рабочай моладдзю, працоўнымі калектывамі.

Нікольні не змяншаючы станоўчых аспектаў у існуючай практыцы ацэнкі работы вузаўскіх грамадазнаўцаў, хацелася б выказаць наступную думку: да ацэнкі працы выкладчыка патрэбна падключыць і грамадскую думку студэнтаў, тых, для каго і прызначана іх работа.

**І. МАРОЗАЎ,**
дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў, кандыдат філасофскіх навук.

**МАРШРУТАМІ ЗОРНЫХ ПАХОДАЎ**

# ЛЫЖНЁЮ ПОДЗВІГУ

**У гэтым годзе ў зорных паходах прымалі ўдзел восем універсітэцкіх груп. Галоўная мэта паходаў — бліжэй пазнаёміцца з гісторыяй свайго народа. Сёлетнія зорныя паходы прысвечаны 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне і Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве.**

ТАДЫ, калі прадстаўнікі камітэта камсамола універсітэта сабралі ўдзельнікаў усіх груп разам, каб пажадаць ім спадарожнага ветру, добрай лыжні, даць апошнія парады, удзельнікі групы, якой кіравала Ганна Бяліцкая, студэнтка 5-га курса гістарычнага факультэта, для сябе адзначыла: «Толькі адна наша група ідзе за межы рэспублікі — у Эстонскую ССР, астатнія — па Беларусі».

...Мехікаорма (руская назва Узмень) — гарадскі пасёлак на беразе Чудскага возера. Семсот трыццаць чатыры гады назад ля пасёлка пад кіраўніцтвам Аляксандра Неўскага рускія войскі атрымалі перамогу над нямецкімі рыцарамі. Па месцах слаўных перамог прайшла лыжня ўдзельнікаў зорнага паходу. І ўсюды, дзе б яны ні былі, з кім бы ні сустракаліся, заўсёды іх прымалі шчыра, пасяброўску. Алене Кавальчук, Алене Русак, Вячаславу Куліку даводзілася не адзін раз выступаць і перад выхаванцамі дзіцячага дома, і перад вучнямі ў школе. І яны заўсёды з вялікай любоўю расказвалі пра Беларусь, пра універсітэт... А потым была сустрэча.

**З дзённіка паходу:**

**Караткоў Яўген Іванавіч, год нараджэння 1923, 22 чэрвеня, член КПСС.**

**Нарадзіўся Яўген Іванавіч у Мехікаорме ў беднай сям'і. У 1940 годзе, калі ў Эстоніі была ўстаноўлена Савецкая ўлада, Яўген Іванавіч уступіў у камсамол, працаваў піянерважатым у рускай шасцікласнай школе.**
**З пачаткам вайны актывізаваліся дзеянні ворагаў. 4 ліпеня актывісты Мехікаормы пераехалі цераз возера, ратуючыся ад бандытаў. Потым Яўген Іванавіч ваяваў пад Вялікімі Лукамі і пад Нарвай, на тэрыторыі Эстоніі. У мірны час працаваў на партыйнай рабоце. На грудзях ветэрана побач з баявымі ўзнагародамі зззяе медаль «Ветэран працы».**

Сустрэча з Яўгенам Іванавічам наклала нейкі своеасаблівы адбітак на кожнага ўдзельніка паходу. Яны нібы пасталелі, пасур'ёзнелі...

А вось час наведвання Таліна быў багаты на сустрэчы са сваімі равеснікамі — студэнтамі талінскіх ВНУ. Гэтыя сяброўскія сустрэчы пацвердзілі, што для моладзі галоўная мэта — захаванне міру. А яго зберагчы можна тады, калі добра ведаеш, якой цаной ён заваяваны. Таму і піша моладзь гісторыю. На лыжах, з рукзаком за плячыма, з блакнотам у руках...

* * *

ЛАРЫСА БАРУШКА здавала апошнія экзамены. Хацелася здаць іх хутчэй і паехаць дамоў, бо не так часта даводзіцца ёй праводзіць канікулы дома. Неяк сустрэлася са студэнтамі першага курса.

— Ведаеш, Ларыса, а мы ў паход сабраліся. Можа пойдзеш з намі кіраўніком?

Што адказаць Ларысе? Зусім па-іншаму яна планавала свой вольны час. Ды і студэнты — першакурснікі. Ці змогуць яны вытрымаць паход? І наогул, як ёй, дзяўчыне, кіраваць амаль мужчынскай групай?

— Пайду,— вырашыла Ларыса.

Цяпер, калі група ў саставе пяці чалавек: Валерыя Радзецкага, Тадэуша Наваградскага, Міхаіла Нікіціна, Вячаслава Мойсака, Алы Барысенка прайшла па маршруту Мінск — Стоўбцы — Карэлічы — Мір — Навагрудак — Мінск, Ларыса з задавальненнем можа сказаць, што паход атрымаўся. Дарэчы, гэта не толькі яе меркаванне. «Зорны паход мне вельмі спадабаўся. У паходзе была праверана таварыская ўзаемавыручка, з'яднанасць усяго калектыву. А як жа іначай? Без гэтага паход проста б не атрымаўся. Былі непрыемныя моманты ў час руху — ламаліся лыжы, але Слава Мойсак не даваў засмучацца. Ён адразу браўся за рамонт. Некалькі хвілін — і зноў ідзём па абранаму шляху. Вельмі хочацца, каб такія паходы былі часцей». Так успамінае аб паходзе Валерый Радзецкі.

**З дзённіка паходу:**

**Паваротны Валянцін Рыгоравіч. Нарадзіўся ў 1918 годзе. Ваенная біяграфія пачалася ў саракавым, калі ён быў прызваны на службу ў рады Савецкай Арміі ў зенітна-артылерыйскі полк. Вайна застала на Ладажскім возеры. Адразу была створана лінія абароны, а на раніцу высветлілася, што лінія абароны стала перадавой. Вымушанае адступленне. Валянцін Рыгоравіч зведаў усё: і жудасць ваеннага ліхалецця. і холад марознай зімы, і смак блакаднага кавалачка хлеба. Варожая куля вывела са строю Валянціна Рыгоравіча. Падлячыўшыся ў шпіталі, ён зноў сярод абаронцаў Ленінграда.**

**Ніколі яму, чалавеку, пражыўшаму вялікае жыццё, шмат пабачыўшаму на сваім вяку, не забыцца пра тыя хвіліны, якія сталі сімвалам яго жыццёвых ідэалаў — 28 лютага 1945 года ён папоўніў рады членаў Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.**

У Карэлічах адбылася сустрэча з былымі партызанамі В. Р. Бурцавым, І. В. Лейка, Л. І. Васілеўскім. На брацкіх могілках знайшлі магілу Міхаіла Андрэевіча Белуша, партызана атрада «Кастрычнік», які паўтарыў подзвіг Аляксандра Матросава.

У Любчы сустрэліся з Таццянай Міхайлаўнай Сячко, сястрой падпольшчыцы Люсі Сячко, якая ў вёсцы арганізавала падпольную групу, наладзіла сувязь з камсамольцамі іншых вёсак, пазней стала сакратаром падпольнай камсамольскай арганізацыі Любчанскага раёна. 22 мая 1944 года Люся Сячко загінула ад рук фашысцкіх катаў.

Тымі мясцінамі, дзе калісьці з баявымі заданнямі хадзілі Міхаіл Белуш, Люся Сячко, прайшлі з баявымі заданнямі сваіх маладых сэрцаў юнакі і дзяўчаты гістарычнага факультэта.

**А. МАТУСЕВІЧ,**
**наш кар.**

**АПАВЯДАННЕ**

# ПРАЗ ГАДЫ...

**Алена**
**БАГАМОЛАВА,**
**студэнтка філалагічнага факультэта.**

БОСЕНЬ выдалася не такая, як заўсёды. Лес яшчэ мала «нашыў» жоўтых латак на свой зялёны сарафан, яшчэ не спелі развітальную песню журавы, яшчэ вецер-пастух калі-нікалі разганяў на небе хмары — і тады сонейка ўсміхалася, але па гэтай усмешцы ўжо адчувалася, што восень узяла ўладу ў свае рукі. Ад дажджу апусцілі травы свае ацяжалелыя сцяблінкі, кветкі пазакрывалі рознакаляровыя вочкі, змоўклі птушкі... Здавалася, уся прырода адчула змены. І не толькі прырода. Нават людзі сталі радзей з'яўляцца на шырокіх вуліцах Бярозаўкі, невялікай вёсачкі, што размясцілася сярод лесу. Толькі бабка Ганна не звяртала ўвагі на надвор'е і ўсё корпалася ў сваім агародчыку. Старая раз-пораз пазірала на вокны, ля якіх сядзелі дзве ўнучкі — Галя і Верачка — сынавы дочкі.

Але аднойчы раніцой бабка Ганна пачала некуды збірацца. Яна апранула святочную сукенку, запляла ў косы доўгія, калісьці чорныя валасы, завязала белую хустку, а калі ўзялася за жакет, старэйшая ўнучка не вытрымала:

— Бабуля, ты гэта куды? На вуліцы дождж, холадна, а ты па-святочнаму...

— Спі, Галечка,— супакоіла старая ўнучку.— Верачка прачнецца, пакармі. А я хутка вярнуся.— І яна ціхенька прычыніла за сабой дзверы.

Бярозаўцы ўжо перасталі дзівіцца, калі раз у год, восенню, бачылі святочна апранутую Ганну, якая ішла ў бок лесу. Ішла раніцой, а вярталася ў поўдзень. Нікога гэта чамусьці не цікавіла: пайшла і пайшла, можа лесам любавацца, можа адпачыць, ды мала па якіх справах. Пра гэта яна нікому не казала. Але сёння ўжо пачало змяркацца, а дамоў бабка Ганна яшчэ не вярталася. Унучкі пачалі хвалявацца: малая Верачка хныкала, Галіна разпораз выбягала на двор глянуць, ці не ідзе бабуля. Нарэшце дзяўчынка аднесла сястрычку суседзям, сама ж падалася ў лес. Яна знайшла бабулю каля невялічкага кургана.

— Родная ты мая бабулечка!— заплакала Галя, абхапіўшы яе за плечы.— Дзе ты так доўга была?

— Тут і была ўвесь час.

— Ты кожны раз сюды ходзіш? Скажы, чаму? Чаму ты ніколі не расказваеш?.. Вось і суседка сёння казала, што рабіць табе няма чаго. Ну раскажы, прашу цябе.

— А што расказваць?— задумалася старая.— Дзед твой тут пахаваны...

— Які дзед?— здзівіўшыся, перапытала Галя.

— Твой дзед. Канешне, ніхто нідзе не запісаў, што ён мой муж, а твой дзед. Але як мы кахалі адзін аднаго! А пазнаёміліся ў атрадзе. Я адразу сувязной была, у Віцебск, Оршу хадзіла — цяжка даводзілася. Спачатку вельмі баялася. Іду міма фашыстаў і ад страху ногі дрыжаць, мову займае. Потым шпік нейкі аб'явіўся, зямля б яго не насіла. Ён мяне і выдаў. На шчасце, камандзіра папярэдзілі, і я засталася ў атрадзе, стала дапамагаць доктару. Аднойчы прынеслі раненага з задання. Быў ужо канец верасня сорак другога года...

* * *

**— Галіна!.. Кліч доктара! Хутчэй! Эх, гады! Такога разведчыка...—крычаў, задыхаючыся, Міцька Стах.**

**Пакуль дзяўчына збегала па доктара, ранены перастаў стагнаць. Аднак Васіль Пятровіч, агледзеўшы партызана, сказаў:**

**— Павінен жыць, куля не закранула сэрца. Кладзіце хутчэй на стол, неабходна тэрміновая аперацыя.**

**Цэлыя тры гадзіны сябры з хваляваннем чакалі выніку, курылі, перакідваліся словамдругім. А Галя ў гэты час завіхалася каля стала, падаючы доктару інструменты. У яе дрыжалі рукі, твар пакрыўся кроплямі поту. Калі хлопец пачынаў стагнаць, вочы дзяўчыны напаўняліся слязьмі.**

**Потым яна праседзела каля яго трое сутак, нават не ведаючы імя гэтага чалавека. Калі-нікалі да яго заходзілі сябрыразведчыкі, ціха ўздыхалі. Толькі Міцька Стах заўсёды шумна з'яўляўся ў зямлянцы:**

**— Спіць, яшчэ спіць,— дзівіўся ён.— Галечка, як ён, наш сокал?**

**— Жар быў сёння, трызніў усю ноч, а зараз вось заснуў,— сумеўшыся, адказала Галя.**

**Праз гадзіну пасля апошняга Міцькавага прыходу раненны расплюшчыў вочы і застагнаў:**

**— В а д ы, с я с т р ы ч к а... Пі-і-іць...**

**Галя хуценька падала яму ваду, старалася зрабіць усё, каб хлопцу было лягчэй.**

**На наступны дзень, з дазволу ўрача, раненага вынеслі з зямлянкі. Стаяў цудоўны восеньскі дзень, канец бабінага лета. Тонкія нітачкі павуціння абвілі высокія сосны і густы бярэзнік. У вяршалінах дрэў гуляў вецер, абрываючы жаўцеючае лісце. Апошняе нібы вальсіравала ў паветры пад яго музыку. Адзін з лісточкаў упаў Галіне на калені.**

**— Праўда, прыгожы,— спытала яна ў раненага?**

**— Як і ты...— Ён усміхнуўся, а дзяўчына, пачырванеўшы, апусціла вочы.**

**— Чаму ты не пытаешся, як мяне завуць? Цябе Галя, я ведаю. А можа і ты ведаеш?**

**— Не,— пакруціла яна галавой.— А як?**

**— Павел.**

**— Павел,— паўтарыла яна. Не прайшло і месяца, як Васіль Пятровіч дазволіў выпісаць Паўла Маркава. Аднак на Галю хлопец не забыўся. Калі выпадаў час, заўсёды забягаў, хоць на хвіліну. Яна хвалявалася, прасіла берагчы сябе. Пры ёй Павел станавіўся нейкім ціхім, разважлівым, хаця ў баі заўсёды быў героем. Здавалася, што свінцовы дождж быў для яго даждом звычайным. «Не бойся прамокнуць,— казаў ён.— Бойся застацца сухім».**

**Аднойчы прыбег да Галі з кветкамі, садовымі рамонкамі. Гэта ўжо было летам сорак трэцяга.**

**— Дзе ты іх узяў?— спытала дзяўчына, здзівіўшыся.— У лесе — садовыя рамонкі?**

**— У вёсцы,— усміхнуўся хлопец.— У разведку хадзілі.**

**— Дзякуй, каханы,— прашаптала Галя і зрабіла крок насустрач яму. Ён падхапіў яе на рукі і закружыў, цалуючы рукі, вочы, валасы, вусны...**

**Адзвінела лета. Прайшла яшчэ адна восень, восень у акупацыі. Восень з плачам птушыным, з болем чалавечым...**

**Неяк фашысты пранюхалі, дзе знаходзіцца партызанскі атрад. Месца лагера давялося тэрмінова мяняць. Ужо тыдзень нямецкія самалёты кружылі над лесам, бамбілі.**

**А потым гітлераўцы рынуліся па лясных сцежках. Калону адступаючых партызан замыкала група, у якой былі Павел Маркаў, Міцька Стах і яшчэ некалькі маладых хлопцаў. Яны атрымалі загад: затрымаць немцаў. Бой быў няроўным. Але цаной свайго жыцця яны дапамаглі атраду адарвацца ад фашыстаў.**

**За смерць таварышаў партызаны адпомсцілі спаўна. Хутка яны выгналі акупантаў з роднай Віцебшчыны, роднай Беларусі.**

* * *

...Бабка Ганна змоўкла. Ласкава пагладзіла ўнучку па галаве:

— Так, Павел загінуў. Але для мяне ён жыве ў маім сыне, тваім бацьку. Як вечна будуць жыць у сэрцах людзей тыя, хто аддаў сваё жыццё за Радзіму.

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

Зак. 2239. АТ 13136.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ